Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_____________ А.А. Корбут
«28» чэрвеня 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-04/эвуч.

# УЗРОСТАВЫЯ (ДЫФІРЫНЦЫРАВАНЫЯ) ТЭХНАЛОГІІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*

*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2017 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-23 01 14-2013 Сацыяльна-культурная дзейнасць і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэг. № Е23-1-75/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*В.У.Рагачова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю.У.Міцкевіч,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Ю.А.Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці* ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол № 10 ад 30.05.2017)

*прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол № 5 ад 28.06.2017)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма “Узроставыя (дыферэнцыраваныя) тэхналогіі СКД” распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці 1-23 01 14 “Сацыяльна-культурная дзейнасць”. Прапанаваная праграма з`яўляецца лагічным працягненнем і паглыбленнем ведаў, атрыманых студэнтамі ў выніку авалодання такімі дысцыплінамі як “Педагогіка і псіхалогія”, “Сацыяльна-культурная дзейнасць” і інш.

У сучасных умовах, калі значна ўзрос інтарэс да кожнай асобы з яе праблемамі, патрэбнасцямі, інтарэсамі і адпачынкавымі перавагамі, асобую актуальнасць набірае асобасна-арыентаваны падыход у арганізацыі СКД розных узроставых і сацыяльных груп. Гэта патрабуе не толькі актывізацыі ўсіх сацыяльных інстытутаў па фарміраванні асобы, але і роста прафесіяналізму спецыялістаў СКД, які заключаецца ў авалоданні сучаснымі тэхналогіямі СКД. Тэхналагічны падыход да аналізу сучаснага стану СКД прадпалагае выяўленне сукупнасці асноўных метадаў, прыемаў і спосабаў уздзеяння на сацыяльна-культурныя патрэбнасці, інтарэсы і каштоўнасныя арыентацыі розных сацыяльных груп з мэтай фарміравання іх сацыяльна-культурнай актыўнасці праз пагружэнне ў сацыяльна значную культурна-дасугавую практыку.

Мэта вывучэння дысцыпліны – авалоданне метадамі, сродкамі і формамі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, накіраванымі на работу з асобнымі катэгорыямі насельніцтва і рознымі узроставымі групамі.

Задачы курса:

- даць асноўныя веды пра сутнасць і віды ўзроставых тэхналогій СКД;
- сфарміраваць у будучых спецыялістаў уменні і навыкі ў галіне тэорыі практыкі выкарыстання ўзроставых тэхналогій у СКД;
- навучыць будучых спецыялістаў СКД ствараць і мадэліраваць культурна-дасугавыя праграмы і мерапрыемствы з улікам узроставых асаблівасцей насельніцтва.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен ***ведаць:***

- сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі ўзроставых катэгорый насельніцтва;
- метады, формы і сродкі СКД у рабоце з рознымі катэгорыямі насельніцтва і ўзроставымі групамі;
- тэхналогіі СКД з рознымі ўзроставымі групамі.

***умець:***

- валодаць методыкай СКД з рознымі узроставымі групамі;
- арганізоўваць СКД з рознымі катэгорыямі насельніцтва і узроставымі групамі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам пасля завяршэння навучання ў установе вышэйшай адукацыі спецыяліст сацыяльна-культурнай сферы павінен быць падрыхтаваны да розных відаў дзейнасці, якія суадносяцца з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі. Акадэмічныя кампетэнцыі праяўляюцца ў авалоданні ўменнямі выкарыстання базавых навукова-тэарэтычных ведаў для вырашэння тэарэтычных і практычных задач; авалоданні сістэмным аналізам. Патрабаванні да асобасных кампетэнцый мяркуюць фарміраванне здольнасцяў да міжасобасных камунікацыі, да сацыяльнага ўзаемадзеяння. Прафесійныя кампетэнцыі праяўляюцца ва ўменні ўключаць людзей у працэс бесперапыннага адукацыі, сацыяльна-культурнай творчасці; ў набыцці новых ведаў, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Структура вучэбнай дысцыпліны ўключае чатыра радзела, кожны з якіх дает уяўленне аб тэхналогіі СКД з рознаўзроставымі катэгорыямі насельніцтва. Раздзел I прысвечаны тэхналогіі СКД дзяцей і падлеткаў, раздзел II – тэхналогіі СКД моладдзі, раздзел III – тэхналогіі СКД людзей сярэднега ўзросту і раздзел VI – тэхналогіі СКД пажылых людзей.

Згодна з мэтай і задачамі дадзенай дысцыпліны асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання з’яўляюцца: праблемнае навучанне (часткова пошукавы і даследчыя метады); інтэрактыўныя тэхналогіі; заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання, камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, круглы стол, майстар-клас і інш.).

Самастойная работа ажыццяўляецца ў выглядзе аўдыторных і пазааўдыторных формаў (вусныя апытанні пад час заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах дысцыпліны, распрацоўка сцэнарыеў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей канкрэтнага соцыуму).

Курс разлічаны на два семестры. Тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Узроставыя (дыферэнцыраваныя) тэхналогіі СКД” адведзена ўсяго 100 гадзін, з іх 54 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20, практычныя – 48 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### *Уводзіны*

Узроставыя (дыферэнцыраваныя) тэхналогіі СКД як вучэбная дысцыпліна, яе месца і роля ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны, яе асноўны змест. Структура вучэбнага курса і яго вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Сістэма праверкі і ацэнкі ведаў па курсу.

## РАЗДЗЕЛ 1 ТЭХНАЛОГІІ СКД ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ

### *Тэма 1. Сутнасць і віды ўзроставых тэхналогій СКД*

Тэхналогія СКД як сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць нармальнае функцыянаванне сацыяльна-культурных інстытутаў. Тыпы ўзроставых тэхналогій СКД. Сацыяльна-дыферэнцыраваныя тэхналогіі для дзяцей, падлеткаў, моладдзі, сярэднега ўзросту і пажылых. Асаблівасці сацыяльных тэхналогій СКД. Крытэрыі выбару тэхналогій. Выды тэхналогій. Аздараўленчыя ўзроставыя тэхналогіі: медыка-біялагічныя, курортныя, лячэбна-прафілактычныя, спартыўна-аздараўленчыя.

### *Тема 2. Характарыстыка сістэмы дзіцячых сацыяльна-культурных устаноў*

Асноўныя накірункі дзейнасці дзіцячых сацыяльна-культурных устаноў: адукацыйная, выхаваўчая, творчая, рэкрыяцыйная. Методыка і формы арганізацыі СКД у дзіцячых сацыяльна-культурных установах: падлеткавых фарміраваннях, установах клубнага тыпу, аздараўленча-адукацыйных установах, установах дадатковай адукацыі. Дамінуючыя віды дзейнасці ў падлеткавых фарміраваннях. Асаблівасці арганізацыі дасуга дзяцей і падлеткаў у клубах па месцы жыхарства. Арганізацыя дасуга дзяцей і падлеткаў ва ўстановах дадатковай адукацыі. Арганізацыя адпачынку дзяцей і падлеткаў ва ўмовах аздараўленча-адукацыйных устаноў.

### *Тэма 3. Асаблівасці арганізацыі СКД розных катэгорый дзяцей і падлеткаў*

Умовы станаўлення і развіцця адораных дзяцей і падлеткаў. Паняцце “адоранасць”, яго суадносенне з паняццямі”талент”, “творчасць”. Самарэалізацыя адоранай асобы ў СКД. Праблема сацыяльна-культурнай інтэграцыі дзяцей-інвалідаў у сучасных умовах. Праграмна-мэтавы падыход у вырашэнні праблем дзяцінства. Сацыяльна-культурныя тэхналогіі у рабоце анамальнымі дзецьмі: паняцце “анамальныя дзеці”, агульная класіфікацыя і прызначэнне тэхналогій (гульнятэрапія, лялькатэрапія, арт-тэрапія, музычная тэрапія, казкатэрапія і інш.). Паняцці “дэвіянтныя паводзіны”, “цяжкі падлетак”. Асноўныя віды дэвіянтных паводзінаў, дыягностыка іх прычын.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-культурныя тэхналогіі прафілактыкі дэвіянтных паводзінаў дзяцей і падлеткаў.

### *Тэма 4. Тэхналогія СКД з сям'ей*

Паняцце сям'і, яе віды і функцыі. Патрабаванні да работнікаў сацыяльна-культурнай сферы і асноўныя накірункі іх работы з сям'ей (асветніцкая дзейнаць, выхаваўчая дзейнасць, арганізацыя дамашняга выхавання, арганізацыя сямейнага дасуга). Формы сямейных захапленняў: сямейны клуб, турызм, спорт, сумесная творчасць, сямейнае свята. Сучасныя падыходы да арганізацыі сямейнага дасуга. Роля і месца сацыяльна-культурных інстытутаў у арганізацыі педагагічнай прапаганды сярод бацькоў. Формы і метады педагагічнай прапаганды: лекцыі, бяседы, кансультацыі, канферэнцыі і інш.

## РАЗДЗЕЛ 2 ТЭХНАЛОГІІ СКД МОЛАДДЗІ

### *Тэма 5. Агульная характарыстыка СКД маладдзі*

Моладдзь як суб'ект СКД. Сацыяльна-псіхалагічныя ўзроставыя асаблівасці моладдзі, падрыхтоўка да дарослага жыцця. Імкненне да праяўлення індывідуальнасці і самавыявы. Маладзежная культура і прабемы вольнага часу. Сутнась і асноўныя паняцці маладзежнай культуры. Маладзежная палітыка Рэспублікі Беларусь, яе задачы, функцыі і асноўныя кірункі. Нефармальныя аб'яднанні моладдзі ў сацыяльным жыцці грамадства, паняцце і тыпалогія.

### *Тэма 6. Асаблівасці арганізацыі СКД моладдзі*

Дасуг як сфера самарэалізацыі моладдзі. Структура і дынаміка дасугавых інтарэсаў моладдзі. Асноўныя кірункі СКД моладдзі. Выхаваўчая дзейнасць моладдзі ў сацыяльна-культурных інстытутах. Ідэйна-патрыятычнае выхаванне. Маральнае і прававое выхаванне. Экалагічнае, эстэтычнае, фізічнае выхаванне. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнай дзейнасці моладдзі ў сістэме сацыяльна-культурных інстытутаў (народныя ўніверсітэты, школы і цэнтры культуры, лекторыі, курсы і інш.). Культурна-творчая дзейнасць моладдзі (клубы па інтарэсах, калектывы мастацкай самадзейнасці і тэхнічнай творчасці). Рэкрыяцыйна-забаўляльная дзейнасці моладдзі (маладзежныя дыскатэкі, святы, балі, карнавалы, канцэрты, экскурсіі і інш.).

Гістарычная сутнасць маладзежных рухаў. Тыпалогія маладдзежных аб'яднанняў: па зместу дзейнасці, па тэрміну існавання, па форме кіравання. Маладзежныя грамадскія аб'яднанні: валанцеры, скауты. Функцыі кіраўніка грамадскага аб'яднання. Характарыстыка арганізацыйна-прававых формаў грамадскага аб'яднання. Сучасныя праблемы фарміравання грамадскіх маладзежных аб'яднанняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗДЗЕЛ 3 ТЭХНАЛОГІІ СКД ЛЮДЗЕЙ СЯРЭДНЕГА ЎЗРОСТУ

### *Тэма 7. Агульная характарыстыка і асаблівасці арганізацыі СКД людзей сярэднега ўзросту*

Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці ўзросту. Паняцце катэгорыі “сярэдні ўзрост”, яе тэрміновыя граніцы. Сацыяльны статус людзей сярэднега ўзросту. Фізіялагічныя асаблівасці ўзросту. Псіхалагічныя асаблівасці, асноўныя сацыяльныя ролі, асноўныя віды СКД, спецыфіка фарміравання каштоўнаснай сістэмы, каштоўнасныя прыярытэты людзей сярэднега ўзросту.

### *Тэма 8. Змест і дынаміка дасугавых інтарэсаў дарослага насельніцтва*

Тэхналогіі СКД людзей сярэднега ўзросту. Адамашніванне дасуга. Развіцце сямейнай мастацкай творчасці: сямейных хораў, ансамбляў. Рост індывідуальнай творчасці, аўтарскай самадзейнасці, малых формаў і скарачэнне масавай мастацкай самадзейнасці ва ўстановай культуры. Формы сацыяльна-культурнай работы з дарослым насельніцтвам: з мэтай рэалізацыі прафесійнай актыўнасці, фарміравання і падняцця ўзроўню сацыяльнай актыўнасці, з мэтай пазнання, зызодзячы з прыярытэту сямейных каштоўнасцей. Асаблівасці арганізацыі СКД асоб сярэднега ўзросту ў еўрапейскіх краінах.

Паняцце андрагогікі як навукі аб адукацыі дарослых. Асаблівасці адукацыі дарослых. Рэсацыялізацыя дарослых ва ўмовах сучаснай інфарматызацыі грамадства. Самаадукацыя дарослых. Курсы прафесійнай падрыхтоўкі іпераадрыхтоўкі, клубы па інтарэсах, універсітэты і школы культуры, лекторыі, дыскусіі, канферэнцыі, прэзнтацыі, конкурсы і інш. Адукацыйныя сістэмы дарослых: карпаратыўная, спецыялізаваная, віртуальная.

## РАЗДЗЕЛ 4 ТЭХНАЛОГІІ СКД ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

### *Тэма 9. Сацыяльна-культурныя асаблівасці сучаснай геранталогіі*

Старасць як сацыяльна-культурны і дэмаграфічны феномен сучаснасці. Паняцце герыятрыі, геранталогіі. Сацыяльна-псіхалагічныя і асобасныя асаблівасці пажылых людзей. Традыцыйныя і інавацыйныя метады дасугавага садзеяння людзям старшых узростаў: сацыяльныя ільготы, праграмы. Сацыяльная рэабілітацыя пажылых людзей. Спецыфіка працэсу адаптацыі ў сацыяльна-культурнай сферы людзей пажылога ўзросту.

### *Тэма 10. Асаблівасці арганізацыі СКД пажылых людзей*

Асноўныя падыходы да арганізацыі дасуга пажылых людзей: дыферэнцыраванасць, парадача жыццевага вопыту, творчая самарэалізацыя. Сістэма сацыяльна-культурных інстытутаў (дамы прэстарэлых, ветэранаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэабілітацыйныя службы, пансіянаты, санаторыі і інш.). Асаблівасці і асноўныя накірункі дзейнасці па арганізацыі дасуга пажылых людзей ва ўмовах дамоў-інтэрнатаў і іншых медыка-сацыяльных установах (сацыяльна-аздараўленчая работа, сацыяльна-медыцынская рэабілітацыя, сацыяльна-культурная адаптацыя). Шляхі сацыяльнай рэабілітацыі пажылых. Змест і задачы сацыяльнай рэабілітацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Уводзіны | 1 | | | |
| | **Раздзел 1 Тэхналогіі СКД дзяцей і падлеткаў** | | | | |
| 2 | Сутнасць і віды ўзроставых тэхналогій СКД | 1 | | | |
| 3 | Характарыстыка сістэмы дзіцячых сацыяльна-культурных установ | 2 | 4 | 2 | Выступленне на семінары |
| 4 | Асаблівасці арганізацыі СКД розных катэгорый дзяцей і падлеткаў | 2 | 8 | 2 | Рэферат |
| 5 | Тэхналогія СКД з сям'ей | 2 | 6 | 2 | Выступленне на семінары |
| | **Раздзел 2 Тэхналогіі СКД моладдзі** | | | | |
| 6 | Агульная характарыстыка СКД моладдзі | 2 | 6 | | |
| 7 | Асаблівасці арганізацыі СКД моладдзі. Спецыфіка арганізацыі маладзежных рухаў | 2 | 6 | 2 | Прэзентацыя |
| **Раздзел 3 Тэхналогіі СКД людзей сярэднега ўзросту** | | | | | |
| 8 | Агульная характарыстыка і асаблівасці арганізацыі СКД людзей сярэднега ўзросту | 2 | 4 | | |
| 9 | Змест і дынаміка дасугавых інтарэсаў дарослага насельніцтва. Сацыяльна-культурныя аспекты адукацыі дарослых | 2 | 4 | 2 | Мініпраект |
| **Раздзел 4 Тэхналогіі СКД пажылых людзей** | | | | | |
| 10 | Сацыяльна-культурныя асаблівасці сучаснай геранталогіі | 2 | 4 | | |
| 11 | Асаблівасці арганізацыі СКД пажылых людзей | 2 | 6 | 2 | Адказ на пытанні |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Всего** | **20** | **48** | **12** | **экзамен** |

ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

- Для выяўлення ўзроўня вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, якія мае рознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па дысцыпліне "Узроставыя (дыферынцываныя) тэхналогіі СКД" могуць выкарыстоўвацца вусныя апытанні пад час заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах дысцыпліны і выступленне студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках з распрацаванымі імі тэмамі.
- Для вымярэння ступені адпаведнісці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендавана выкарыстанне праблемных, творчых заданняў (напрыклад, распрацоўка сцэнарыеў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей канкрэтнага соцыуму).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

ЛІТАРАТУРА

### Асноўная літаратура

1. Домаренко, Е. В. Возрастные (дифференциальные) социально – культурные технологии : учеб. пособие / Е. В. Домаренко – Орел : ОГИИК, 2003. – 132 с.

2. Ерошенков, И. Н. Возрастные технологии социально-культурной деятельности [Электронный ресурс]: Учебное пособие /И.Н.Ерошенков. – М. : МГУКИ [б. и.], 2011. – 302 с.

3. Киселева, Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельность: учебник. / Т.Г.Киселева. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

4. Современные технологии социально-культурной деятельности: учеб. пособие. – 2-е изд., перераб. и допл. ; М-во обр. и науки РФ, ФГБОУ ВПО «Тамб. гос. ун-т им. Г.Р.Державина». Тамбов: Изд-во ТРОО «Бизнес-Наука-Общество». 2013. – 424 с.

### Дадатковая літаратура

1. Акимова Л. А. Социология досуга : учеб. пособие для вузов / Л.А. Акимова ; М-во образования Рос. Федерации, Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М. : МГУКИ, 2003. – 123 с.

2. Болотова М. И. Организация семейного досуга в образовательной среде учреждения дополнительного образования детей / М. И. Болотова. – М. : Компания Спутник+, 2005. – 52 с.

3. Бочарова Н. И. Организация досуга детей в семье : учеб. пособие для пед. вузов / Н. И. Бочарова, О. Г. Тихонова. – М. : Академия, 2001. – 203 с.

4. Жарков, А.Д. Теория и технология культурно-досуговой деятельности: учебник / А.Д. Жарков. – М.: Издат. дом МГУКИ, 2007. – 480 с.

5. Новикова Г. Н. Технологические основы социально-культурной деятельности : учеб. пособие для вузов по специальности «Соц.-культур. деятельность» / Г. Н. Новикова ; М-во образования Рос. Федерации, Моск. гос. ун-т культуры и искусства. – М. : МГУКИ, 2004. – 174 с.

6. Обухова, Н. В. Детская (возрастная) психология : учеб./ Н.В.Обухова. - М. : Роспедагенство, 1996.- 372 с.

7. Психология человека от рождения до смерти. Полный курс психологии развития / Под ред. А.А.Реана – СПб.: «прайм-ЕВРОЗНАК», 2005. – 416 с.

8. Суртаев В. Я. Социология молодежного досуга / В. Я. Суртаев ; С.-Петерб. гос. акад. культуры. – СПб., 1998. – 223 с.

9. Титов Б. А. Социализация детей, подростков и юношества в сфере досуга/ Б.А.Титов. – СПб. : СПбГАК, 1996. – 275 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

- Для выяўлення ўзроўня вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па дысцыпліне “Узроставыя (дыферынцываныя) тэхналогіі СКД” могуць выкарыстоўвацца вусныя апытанні пад час заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах дысцыпліны і выступленне студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках з распрацаванымі імі тэмамі.
- Для вымярэння ступені адпаведнісці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендавана выкарыстанне праблемных, творчых заданняў (напрыклад, распрацоўка сцэнарыеў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей канкрэтнага соцыуму).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ